Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 ЛІСТАПАДА 2018 г. ЧАЦВЕР № 230 (28846)



У ВЁСКУ — ПА ШЧАСЦЕ І КЛОПАТЫ

Сямейная газета

НЯНЯ Ў ДАПАМОГУ: КАЛІ І КАМУ

Сямейная газета



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СІЗОЎ, намеснік старшыні канцэрна «Белнафтахім»:**

*«У нас у якасці стратэгіі абрана паэтапнае павышэнне цэн на паліва. Мы адсочваем змяненне сітуацыі на рынку, тое, як гэта ўплывае на эканоміку нафтаперапрацоўкі, адсочваем сітуацыю са змяненнем курса. Таксама на нас аказвае ўплыў падатковы складнік. Зыходзячы з гэтых фактараў, менавіта паэтапна змяняецца і кошт на нафтапрадукты».*

# Мастацтва ў шакаладзе



Фота БелТА.

У віцяблянкі Наталлі ЦАПУК незвычайнае хобі: з дапамогай шакаладу яна стварае жывапісныя палотны. Нядаўна ў музеі-сядзібе І. Рэпіна «Здраўнёва» прайшла яе персанальная выстаўка, на якой было прадстаўлена больш за 30 шакаладных карцін.

## КОРАТКА

• Прафсаюзныя прававыя прыёмы 29 лістапада праходзяць у сельскіх населеных пунктах і аграгарадках.

• **Першы ў Віцебскай вобласці эксперыментальны дом з электрычным ацяпленнем пабудаваны ў Лёзне.**

• Вонкавыя работы па аднаўленні паўночнай вежы і сцен Гальшанскага замка плануецца завяршыць да канца года.



• **Узброеныя Сілы Беларусі плануюць прыняць на ўзбраенне да канца года чатыры зенітна-ракетныя комплексы «Тор-М2».**

• Забег Санта-Клаусаў упершыню пройдзе ў Мінску 15 снежня.

• **Рэгістратары ўдакладнілі адрасы ўсіх будынкаў для падрыхтоўкі базы перапісу насельніцтва Беларусі, які пройдзе ў 2019 годзе.**

Вандроўка патрыёта

## Чым прыцягальны Глуск?

Карэспандэнт «Звязды» пра турысцкія выпрабаванні, мясцовыя рэліквіі і «слёзы» святой Валянціны Мінскай

**Нашы турыстычныя вандроўкі па Магілёўскай вобласці працягваюцца. І няхай скептычна ўсміхаюцца аматары далёкіх падарожжаў, якія аддаюць перавагу шырока разрэкламаваным маршрутам. Маўляў, ну што там можна ўбачыць у гэтай беларускай глыбінцы. Дзесьці яны маюць рацыю, сапраўды, часцей даводзіцца задавольвацца прыгожымі краявідамі і легендамі. Але ж яны таксама наша спадчына. Мы працягваем вывучаць айчынны турыстычны патэнцыял і ацэньваць яго даступнасць. Вось, напрыклад, у Глуск з Магілёва ніколі не абернешся за адзін дзень. Чамусьці для адзінага рэйса выбраны не самы зручны час — 15.30. У Глуск аўтобус прыбывае вечарам. Каму гэта цікава? Дакладна не турысту. Але мы не шукаем лёгкіх шляхоў. А сёмай гадзіне раніцы едзем у маршрутцы на Бабруйск, а адтуль у 9.20 накіроўваемся ў Глуск. А палове на адзінаццатую мы ўжо на месцы.**

СТАР. 13



Бюст двойчы Героя Савецкага Саюза С. Ф. Шутава.

Слова ў навуцы

## ЦУДАДЗЕЙНЫ «СТВОЛ» ДРЭВА ЖЫЦЦЯ

Клетачныя тэхналогіі могуць здзейсніць рэвалюцыю ў лячэнні самых цяжкіх захворванняў



**Калі свет упершыню пачуў аб паспяховых медыцынскіх эксперыментах з прымяненнем ствалавых клетак, гэта стала не проста сенсацыяй — цудам, які можна параўнаць хіба што з вынаходствам эліксіру маладосці. Асабліва ўражлівыя натуры на поўным сур'ёзе пачалі казаць аб надыходзе эры бессмяротнага чалавека. Бо цяпер, з захапленнем сцвярджалі яны, у лабараторных умовах можна вырасціць любы орган homo sapiens: ад воласа да пяткі. Аднак хутка высветлілася, што гэта толькі мары. Хоць і не безнадзейныя. Біялагічная навука сапраўды зрабіла апошнім часам такі істотны крок наперад, што дае нам усё больш падстаў для самых аптымістычных спадзяванняў. Выклікае гонар той факт, што Беларусь знаходзіцца сярод краін, якім удалося асвоіць найскладанейшыя тэхналогіі лячэння людзей на аснове ўласцівасцяў клеткі арганізма. Аб гэтым размова з дырэктарам Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук Андрэем ГАНЧАРОВЫМ.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

18230

ЗВЯЗДА
*Да чытача з любоўю!*

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2019 года.

*Заставайцеся з намі — будзе цікава!*

Год малой радзімы

# ДЗЕ РАСПРАЎЛЯЮЦЦА КРЫЛЫ

**Таццяна ГАГАКАВА, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама:**



— Мы жывём і працуем на сваёй зямлі, шмат робім на яе карысць штодзённа. Але Год малой радзімы і наступныя два гады пад гэтым знакам становяцца нагодай сканцэнтраваць увагу на многіх канкрэтных аспектах, з любоўю паглядзець на асобныя гарады, вёскі, мястэчкі, а таксама звярнуцца да сваіх каранёў, гісторыі роднага краю, успомніць знакамітых землякоў.

Многаму з пералічанага паспрыяла падрыхтоўка да Дня пісьменства ў Іванаве. Мясцовасць наогул багатая на імёны, гістарычныя постаці, знакавыя фігуры. Гэта малая радзіма Напалеона Орды, калыска роду Дастаеўскіх, месца нараджэння цэлай плеяды творчых асоб. Яшчэ раз упэўніліся ў гэтым, калі рыхтавалі да свята зборнік «Людзі Янаўскага краю», а таксама праводзілі канферэнцыі і літаратурныя чытанні па творчай спадчыне знакамітых землякоў.

Асабіста для мяне выраз «малая радзіма» цяпер асацыюецца з невялікімі, але дагледжанымі вёскамі і пасёлкамі. Такіх у нас большасць. Літаральна нядаўна давялося працаваць з членамі дэлегацыі Іркуцкай вобласці. Госці ў адзін голас адзначалі нашы чысціню і парадак. Апошняе, як вядома, даецца карпатлівай працай, вялікімі намаганнямі суайчыннікаў. За гэты год у нашай вобласці пасаджана больш за 19 тысяч дрэў, закладзены парк 1000-годдзя ў абласным цэнтры. Узяты курс на добраўпарадкаванне малых гарадоў. Сёлета да абласных дажынак прывялі ў парадак Высокае, на чарзе — Ружаны, якія папрыгажэюць налета.

Вельмі прыемна, што сёлета на кадастравую карту краіны нанесены 68 крыніц Брэстчыны. Спакон веку наш народ абагаўляў крыніцы з чыстай гаючай вадой. А крыніцай духоўнасці заўсёды служылі народная культура, традыцыі, спадчына. У вобласці зараз налічваецца больш за 2,5 тысячы помнікаў гісторыі, культуры, архітэктуры. У гэтым годзе ўстаноўлены помнік Тадэвушу Касцюшку на яго радзіме ў Мерачоўшчыне. Побач працягваецца рэстаўрацыя Косаўскага палаца Пуслоўскіх. Вядзецца далейшая распрацоўка аднаўлення палацавага комплексу Сапегаў у Ружанах. Ідуць рамонтна-аднаўленчыя работы сядзібнага дома Рэйтанаў у Грушаўцы Ляхавіцкага раёна. Варта згадаць і работу па захаванні нематэрыяльных каштоўнасцяў, напрыклад фэст «Жураўінавы край» на Століншчыне, які атрымаў статус міжнароднага, а таксама адраджэнне традыцыі роспісу па шкле на Пружаншчыне.

Хочацца адзначыць удзел моладзі ў мерапрыемствах і кампаніях Года малой радзімы. Сёлета ў Брэсце скончана адзіная ў краіне маладзёжная будоўля і ўрачыста адкрыты Маладзёжны патрыятычны цэнтр на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Моладзь актыўна ўдзельнічае ва ўзвядзенні знакавых для Брэста аб'ектаў, такіх як «Заходні абход», Брэсцкі аўтавакзал. З іх узвядзеннем у эксплуатацыю малая радзіма трохсот тысяч брастаўчан стане яшчэ больш прывабнай і сучаснай.

А на імідж нашай малой радзімы працуюць, несумненна, важныя мерапрыемствы міждзяржаўнага і міжнароднага ўзроўняў, якія нярэдка ў нас адбываюцца. Не так даўно прайшла парламенцкая сесія Саюзнай дзяржавы, на чарзе — пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы. Сюды ж можна аднесці вядомыя культурныя, спартыўныя падзеі. Так, фестывалі «Белая вежа» і «Студзеньскія музычныя вечары» збіраюць штогод дзеячаў мастацтва з дзясяткаў краін.

Цікавых, памятных мерапрыемстваў, якія прайшлі сёлета на малой радзіме знакамітых землякоў, было нямала. Напрыклад, змястоўнай атрымалася імпрэза, прысвечаная 220-й гадавіне з дня нараджэння Адама Міцкевіча ў Баранавіцкім раёне. А прыкладам стаўлення да роднай мясціны можна назваць работу ўраджэнцаў вёскі Зарэчча Пружанскага раёна. Яны добраўпарадкавалі сквер у вёсцы, паставілі памятны знак, стойкі з партрэтамі 27 абаронцаў Айчыны, якія не вярнуліся з вайны. На ўрачыстасць з нагоды адкрыцця мемарыяльнага сквера прыехалі людзі з розных гарадоў і краін. Гэта стала не толькі днём ушанавання памяці, а святам яднання землякоў, святам любові і ўдзячнасці да сваёй мясціны, месца, дзе распраўляюцца і дужэюць крылы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Меркаванне

# І ШТО ТЫ БУДЗЕШ РАБІЦЬ?

## Суседскі канфлікт вачыма абываццеля

**Падзеі ў Керчанскім праліве значна абвастрылі і так няпростыя адносіны Расіі і Украіны. У гэтай калонцы будзе мінімум палітыкі — толькі жыццёвая сітуацыя, у якой з-за таго, што адбылося, апынуўся наш карэспандэнт.**

Хутка я іду ў адпачынак. Рашэнне для зімы не самае папулярнае, але вельмі доўгачаканае і жыццёва неабходнае. Сядзець у такую пару года ў Мінску — згубна для псіхікі, бо шэрасць і нестабільнасць надвор'я дадална не паляпшае настрой.

Вырашылі невялікай кампаніяй пад Новы год паехаць у Львоў. Прычыны? Віза — не патрэбна, горад — выдатны, атмасфера — казачная, грошы — для выезду за мяжу і праўда невялікія.

Ведаючы шчырую любоў беларусаў да Украіны, вырашылі не зацягваць: да сярэдзіны лістапада былі набыты чыгуначныя білеты туды, а авіябілеты — назад, не забыліся перавесці і перадаплату за кватэру. Здавалася, застаецца толькі грыўні купіць.

І тут адбываюцца вядомыя падзеі ў Керчанскім праліве. З'яўляюцца падрабязнасці, відэазапісы, каментарыі з двух бакоў. На самай справе журналіста даволі цяжка здзівіць — выяўляецца прафесійная дэфармацыя.

Таму і навіна аб магчымым увядзенні ваеннага становішча ва Украіне была ўспрынятая будзённа: на жаль, спрэчныя сітуацыі і рэакцыя на іх для сучаснага свету сталі дадзенасцю і нават штодзённасцю.

А вось пацвярджэнне ваеннага становішча ў літаральным сэнсе прымусіла ачуцца — гэта ж і мяне датычыцца! Далей былі прачытаны без перабольшання дзясяткі навін аб падрабязнасцях, каб разабрацца і зразумець, што рабіць далей.

Уважлівыя чытачы, якія сочаць за сусветным парадкам дня і здагадваюцца, да чаго я вяду сваё апавяданне, могуць перапыніць мяне: але ж ваеннае становішча ўведзена не на ўсёй тэрыторыі Украіны, а ў Вінніцкай, Луганскай, Мікалаеўскай, Адэскай, Сумскай, Харкаўскай, Чарнігаўскай і Херсонскай абласцях, а таксама ва ўнутраных водах Азова-Керчанскага праліва.

Сапраўды, той жа Львоў або Кіеў застаецца адкрытым для падарожжаў, а вось перад паездкай, напрыклад, у Адэсу, чалавек, магчыма, задумаецца.

Нагадаю, ваеннае становішча простымі словамі — гэта вельмі сур'ёзная сітуацыя, якая накладае на тэрыторыю пэўную колькасць лімітаў. Хоць прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка ў інтэрв'ю тэлеканалам ужо паабяцаў, што пасля ўвядзення такога становішча абмежаванняў канстытуцыйных правоў грамадзян не будзе.

Аднак матэрыял усё ж пра іншае: што рабіць беларусам, якія, як і я, хацелі правесці навагоднія святы ва Украіне? Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Украіны ў Беларусі Ігар Кізім у інтэрв'ю tut.by падкрэсліў: «Беларусы могуць спакойна адпраўляцца на ўкраінскую тэрыторыю».

Сапраўдная мудрасць народа (гэта сказана без сарказму) сканцэнтравана ў каментарыях да навін. Так, пад матэрыялам на адным папулярным гарадскім партале было сказана: «Рабяты, баяцца сапраўды не трэба — хто ездзіць ва Украіну, той ведае, наколькі там добра ставяцца да беларусаў».

І адразу ў процівагу адказ: «Так, стаўленне цёплае, але што гэта за адпачынак такі, калі ты прыязджаеш і вымушана адсочваеш усе навіны? Бо ў адпачынку многія хочуць адгарадзіцца ад вонкавай мітусні, выдыхнуць і, нарэшце, расслабіцца. Ці рэальна гэта ў падобнай сітуацыі?»

І не так важна, што гэта за горад, што гэта за вобласць, трапляе яна пад ваеннае становішча ці не — тут узнікае чарада пытанняў, якія пачынаюцца са слоў «А што, калі?».

Сама сітуацыя, акрамя шчырага спачування людзям, выклікае пачуццё татальнай няўпэўненасці, якое слаба паддаецца логіцы. Што рабіць, якое рашэнне прыняць — вяртаць грошы ці ўсё-ткі паехаць, — я, напрыклад, зараз адказаць на гэтыя пытанні не магу. Чаму? Таму што я не ведаю, што будзе далей. Ды і хто ведае?

А як бы ў такой сітуацыі паступілі вы?

**Ігар КАРПІН.**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:** капитальное строение, инв. № 420/С-2362 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада арочника), общей площадью 995,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14К и зеленые насаждения (деревья – 15 шт., кустарник – 90 п. м)

Земельный участок, на котором расположен объект: кадастровый № 423650100005001089, площадью 0,6143 га (назначение – земельный участок для обслуживания арочного склада), находится по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14К. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, код – 5,5, площадью 0,0620

Начальная цена продажи – 99 760,61 руб. (девяносто девять тысяч семьсот шестьдесят рублей шестьдесят одна копейка) с учетом НДС. Сумма задатка – 4 988 руб. (четыре тысячи девятьсот восемьдесят восемь рублей)

Продавец – ОАО «Лидский завод электроизделий», 231300, г. Лида, ул. Фабричная, 4, тел. 8-0154-52-13-47

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Условия аукциона – возмещение победителем аукциона затрат Продавца по организации и проведению аукциона, в том числе по уплате вознаграждения Организатору торгов в размере 4 % от конечной цены продажи объекта. Условия оплаты – 100 % предоплата в течение 5 банковских дней с даты подписания договора купли-продажи объекта. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 12 декабря 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов.

Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» от 28.04.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 7 декабря 2018 г. до 15.00**

*Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: http://grodnoino.by*

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Минский комбинат хлебопродуктов», г. Минск, ул. Слесарная, 48 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Жилой дом** | Здание одноквартирного жилого дома | 99,1 кв. м | 601/С-13258 |
| **Адрес** | Минская обл., Логойский р-н, Острошицкий с/с, д. Бояры, ул. Центральная, д. 12 | | |

Составные части и принадлежности: одноэтажный кирпичный жилой дом с сараем пристройкой 1

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | пл. 0,0851 (га), предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт, пл. 0,005 га |

**Начальная цена без учета НДС – 13 489,85 бел. руб. (снижена на 10 %)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» 02.10.2018 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **19.12.2018 г.** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **17.12.2018 г.** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

# «Мы сваёй Беларуссю ганарымся»

Падведзены вынікі і ўзнагароджаны пераможцы адкрытага конкурсу фотаздымкаў і відэаролікаў «Мы сваёй Беларуссю ганарымся», які быў прымеркаваны да Года малой радзімы. Амаль з чатырохсот творчых праектаў, дасланых на конкурс, журы трэба было адабраць найлепшыя. І вось у аўторак у зале Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці адбылося ўрачыстае віншаванне пераможцаў. **Дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Павел САПОЦЬКА** адзначыў, што колькасць дасланых работ і геаграфія ўдзельнікаў яскрава сведчаць аб тым, што мерапрыемства зацікавіла шырокія колы насельніцтва.



— Нам было вельмі цікава ўбачыць, як па-рознаму людзі ўспрымаюць паняцце — малая радзіма. Праз свае работы кожны творца паказаў сябе як паўнавартасную творчую асобу і выказаў сваю любоў да Айчыны.

У намінацыі «Фотаздымак» перамог Міхаіл Капычка з фотаработай «Каханне», другое месца ў Ганны Хатылёвай — «Зямля бацькоў — мая зямля», трэцяе — у Валерыя Казуба з работай «Восень на Цнянскім вадасховішчы».

У намінацыі «Відэаролік» месцы размеркаваліся наступным чынам:

трэцяе месца ў Леаніда Хвашчынскага з работай «Заслаўе time lapse», другое — у Аляксандра Гавейкі і яго відэароліка «Сны аб малой радзіме». Найлепшым жа, хто праз відэа змог перадаць сваю любоў да Беларусі, на дзіва стаў не беларус, а італьянец. Франка Навяцента Буцігіеры і яго творчы праект «Belarus, Land of Legends» атрымаў найвышэйшую пахвалу журы і першае месца.

Аднак на гэтым узнагароды не скончыліся. Члены журы і партнёры праекта таксама адзначылі спецыяльнымі прызамі асобных удзельнікаў конкурсу, чые работы выклікалі найбольшую цікавасць.

Адзін з пераможцаў конкурсу Леанід Хвашчынскі падзякаваў арганізатарам за магчымасць рэалізаваць творчы патэнцыял. Ён выказаў надзею на тое, што такія мерапрыемствы стануць праводзіцца часцей, бо гэта ўносіць вялікі ўклад у развіццё беларускай культуры.

**Андрэй САЗОНАЎ, фота аўтара.**

# ВЕЛЬМІ ДАЛЁКАЯ ДУГА

## Экспа-Фэст Інданезія-Беларусь скараціў адлегласць паміж краінамі




Фота Андрэя САЗОНАВА.

**А адлегласць гэтая па прамой на самалёце — каля дзесяці тысяч кіламетраў. Тым не менш мы прадаём у найбуйнейшую астраўную дзяржаву свету калійныя ўгнаенні, гетэрацыклічныя злучэнні азоту, шыны, поліаміды, шпалы, медыцынскую мэблю, трактары, апаратуру і абсталяванне.**

Купляем там натуральны каўчук, пальмавы і какосавы алей, авпавалакно, лекі, волава, паперу, какаву, фарбавальнікі, абсталяванне для друкавання, рыбу і іншае. Дарэчы, тавараабарот з гэтай краінай за дзевяць месяцаў сёлета на 74 % перавысіў леташні паказчык і склаў амаль 200 мільёнаў долараў (за ўвесь 2017 год — 158 мільёнаў). Гэта, можа, і не шмат, але, напрыклад, з Венгрыяй, да якой у дзесяць разоў бліжэй, мы нагандлявалі ўсяго на 148 мільёнаў долараў. Пры гэтым сальда ў нас з Інданезіяй дадатнае і роўнае суме ўсяго тавараабароту з Венгрыяй.

На такім фоне фестываль «Экспа-Фэст Інданезія-Беларусь 2018» ладзіць асабліва прыемна. Да таго ж, сёлетняе свята прымеркавана да 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж краінамі. Арганізатарам выступіла пасольства Рэспублікі Інданезія ў Беларусі пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і Беларускай гандлёва-прамысловай палаты.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Інданезія ў Расіі і Рэспубліцы Беларусь Вахід Мухамед СУПРЫЯДЗІ адзначыў, што фестываль упершыню арганізаваны з такім размахам. На выстаўцы размясцілася каля 20 стэндаў, дзе можна было ўбачыць і набыць інданезійскія прадукты, прадметы інтэр'ера, тэкстыльныя вырабы, сувеніры і многае іншае.

— Два дні таму мы паспяхова правялі беларуска-інданезійскі бізнес-форум, на якім абмеркавалі магчымасці для супрацоўніцтва, — абвясціў наведвальнікам фестывалю пасол і выказаў надзею на далейшае ўмацаванне двухбаковых адносін.

Начальнік упраўлення Азіі, Аўстраліі і Акіяніі Міністэрства замежных спраў Беларусі Сяргей ЦЯРЭНЦЬЕЎ дадаў, што за 25 гадоў удалося значна паглыбіць палітычныя і гандлёвыя сувязі, дзякуючы чаму інданезійцы, у прыватнасці, ведаюць такія беларускія брэнды, як БелАЗ, Мінскі трактарны завод, Беларуськалій.

Аб планах па арганізацыі ў кастрычніку наступнага года нацыянальнай беларускай экспазіцыі ў Джакарце паведаміў на адкрыцці фестывальнай экспазіцыі старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ.

Дарэчы, Інданезія з'яўляецца найбуйнейшай краінай Паўднёва-Усходняй Азіі і займае чацвёртае месца па колькасці насельніцтва (больш за 261 мільён чалавек). Яна адносіцца да катэгорыі найбольш перспектыўных у эканамічным плане краін, якія развіваюцца.

**Ганна ЮНЧЫЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Тысячы людзей былі эвакуяваны з гандлёвых цэнтраў у Маскве

Учора з дзесяці маскоўскіх гандлёвых цэнтраў з-за паведамленняў пра пагрозы выбуху былі эвакуяваны некалькі тысяч чалавек. Пра гэта ТАСС паведаміла крыніца ў экстранных службах.

«У аператыўныя службы паступілі паведамленні пра пагрозы выбуху ў больш чым дзесяці гандлёвых цэнтрах. З будынкаў эвакуяваны некалькі тысяч чалавек», — сказаў суразмоўнік агенцтва. Сярод «замініраваных» гандлёвых цэнтраў — «Атрыум», «Мегаполіс», «Капітолій» і іншыя.

У будынках гандлёвых цэнтраў працавалі паліцэйскія і кінолагі, якія абследавалі тэрыторыю.

Хваля ілжывых мініраванняў прайшла ў Расіі з верасня па снежань 2017 года. Тады атацы тэлефонных тэрарыстаў падвергліся амаль чатыры тысячы аб'ектаў, былі эвакуяваны больш за 2,6 мільёна чалавек.

### Парашэнка сцвярджае, што ЗША паабяцалі яму «поўную падтрымку»

Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка заявіў, што дзяржсакратар ЗША Майкл Пампеа падчас тэлефоннай размовы, якая адбылася 27 лістапада, паабяцаў Кіеву падтрымку ў абароне суверэнітэту краіны.

«Падчас тэлефоннай размовы з Майкам Пампеа ён паабяцаў мне, што ЗША акажуць поўную дапамогу, у тым ліку ваенную дапамогу, па абароне суверэнітэту Украіны», — сказаў Парашэнка ў інтэрв'ю тэлеканалу CNN.



У панядзелак кіраўнік прэс-службы Дзярждэпартамента ЗША паведамляла аб тэлефоннай размове Парашэнкі і Пампеа, падчас якой палітыкі абмеркавалі сітуацыю вакол Керчанскага праліва. Аднак тады, згодна з распаўсюджанай пісьмовай заявай прэс-сакратара Хеззэр Наўэрт, гаворка ішла толькі аб падтрымцы ЗША суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Украіны. Ніякую ваенную дапамогу яна не згадвала.

Размова адбылася пасля інцыдэнту ў Керчанскім праліве, які адбыўся 25 лістапада.

### Жанчына з дзіцем загінулі пасля нападу мядзведзя на поўначы Канады

Жанчына і яе нованароджаная дачка загінулі ў выніку нападу мядзведзя грызлі ў арктычнай канадскай тэрыторыі Юкон. Пра гэта паведаміў тэлеканал CBC са спасылкай на мясцовыя праваахоўныя органы.

Інцыдэнт адбыўся днём недалёка ад паселішча Маё. Драпежнік здолеў прабрацца ў дом 37-гадовай Валеры Тэарэт, дзе яна знаходзілася з 10-месячнай дачкой. Бацька сямейства ў момант нападу адсутнічаў, калі ён вярнуўся, то недалёка ад дома сутыкнуўся з грызлі, якога застрэліў. Пазней ён знайшоў загінуўшых і выклікаў паліцыю, па факце здарэння праводзіцца расследаванне.

Раней паведамлялася, што ў гэтым раёне загінулі два чалавекі, як мяркуецца, пасля нападу белага мядзведзя.

# У сталіцы праходзіць форум «Універсальнае асяроддзе — 2018»

**З 29 лістапада да 1 снежня ў Мінску адбываецца форум «Універсальнае асяроддзе — 2018», прымеркаваны да Міжнароднага дня інваліда. На ім будзе прадстаўлена «ПараЭкспа» — міжнародная выстаўка спецыялізаванага абсталявання, тэхналогій і сэрвісу для рэабілітацыі людзей з інваліднасцю і выстаўка для старэйшага пакалення «50 плюс».**

— Больш за 100 мерапрыемстваў, якія пройдуць за тры дні на ўсіх пляцоўках форуму, носяць забаўляльны характар. Каб чалавек, які прыйшоў на выстаўку, няхай гэта будзе спецыяліст, пенсіянер, чалавек з інваліднасцю ці яго сваяк, не толькі азнаёміўся з выстаўленай прадукцыяй, праблематыкай, задаў пытанні экспертам, без талончыка атрымаў кансультацыю доктара, але і проста адпачыў, — паведаміў **дырэктар арганізатара форуму, выставачнага прадпрыемства «Экспафорум», Аляксандр СТАРЫКАЎ.**

У сталічным выставачным павільёне па праспекце Пераможцаў, 14 кансультацыі правядуць кардыёлагі, псіхолагі, траўматолагі, герантолагі, артапеды. Будзе арганізавана тэставая пляцоўка для інвалідных калясак, прэзентаваны сучасныя пад'ёмнікі, трэнажоры-імітатары хады, спецыяльныя прылады для слабавідушчых і людзей са слабым слыхам. Адбудзецца модны паказ дызайнерскага адзення для інвалідаў-калясачнікаў.

Наведвальнікі змогуць пагутарыць з прадстаўнікамі сацыяльных службаў, медыцынскіх і рэабілітацыйных устаноў, грамадскіх, міжнародных і праваабарончых арганізацый, даведацца, дзе шукаць падтрымку людзям з інваліднасцю, як ім уладкавацца на работу і г. д. Сваякоў, якія клапоцяцца пра людзей з абмежаванымі магчымасцямі і пажылых, навучаць правільнаму дагляду, падбору сродкаў і спосабаў рэабілітацыі для сваіх блізкіх людзей.

Традыцыйна будуць працаваць зоны здароўя, фітнес-зона актыўнага даўгалецця, зона майстар-класаў па рукадзеллі і кулінарных «лайфхаках», кірмаш тавараў для актыўнага і здаровага ладу жыцця.

Акрамя таго, у ходзе работы форуму пройдуць семінары і круглыя сталы для спецыялістаў па актуальных пытаннях сацыяльнай, медыцынскай, культурнай рэабілітацыі і адаптацыі людзей з рознымі формамі інваліднасці і забеспячэння безбар'ернага, універсальнага асяроддзя. Будуць праведзены прэзентацыі і інклюзіўныя майстар-класы.

Форум арганізаваны выставачным унітарным прадпрыемствам «Экспафорум» пад патранажам Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, пры падтрымцы Мінгарвыканкама, грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў.

**У тэму**

### Мінздраў абяцае ўзмоцнены кантроль якасці дапамогі

**Міністэрства аховы здароўя збіраецца выбудаваць сістэму кантролю якасці медыцынскай дапамогі. Пра гэта паведаміў журналістам дырэктар РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Васіль СМЫЧАК.**

Усім нам даводзіцца звяртацца да паслуг медыцынскіх работнікаў. Ні для кога не сакрэт, што часам здараюцца нараканні на іх работу. Таму Міністэрствам аховы здароўя прынята рашэнне аб стварэнні новай арганізацыйнай вертыкалі ацэнкі якасці аказання медыцынскай дапамогі на ўсіх узроўнях. Распрацаваны крытэрыі якасці аказання меддапамогі — сістэма, накіраваная на тое, каб кожны чалавек атрымліваў больш даступную і якасную дапамогу ў кароткія тэрміны.

На базе РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі адкрыты аддзел экспертызы якасці аказання медыцынскай дапамогі, дзе кантроль будзе ажыццяўляцца на рэспубліканскім узроўні. На абласным узроўні ён будзе забяспечвацца на базе МРЭК, на раённым — на базе кожнай бальніцы, аддзялення.

**Святлана БУСЬКО.**

## Тэхналогіі

# Мія гатова з вамі пабалбатаць...

**МТС першы з мабільных аператараў краіны запусціў на сваім сайце віртуальнага памочніка Мію. Інтэлектуальны чат-бот дапаможа выбраць тарыфны план і наладзіць інтэрнэт, а ў час размовы можа жартаваць, здзіўляцца і радавацца.**

Мія падкажа, дзе хутка паглядзець кошт любой паслугі, выбраць тарыф, падкажа, як яго падключыць або адключыць, расскажа аб роўмінгу і акцыях мабільнага аператара, вышле інструкцыю для наладкі інтэрнэту. Пералік магчымасцяў віртуальнага памочніка пастаянна пашыраецца — Мія ўдасканальвае сваю работу і навыкі зносін на аснове аналізу запытаў абанентаў.

Выклікаць Мію можна з дапамогай адмысловай кнопкі на сайце МТС, таксама ёй можна напісаць у паведамленнях суполак кампаніі ў сацсетках «УКантакце» і Facebook або ў месенджарах Telegram і Viber.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЦУДАДЗЕЙНЫ «СТВОЛ» ДРЭВА ЖЫЦЦЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Андрэй Яўгенавіч, нягледзячы на тое, што клетачныя тэхналогіі ў нашай краіне прымяняюцца не першы год, вакол згаданай тэмы шмат разнастайных небыліц і фантазій. Адны ўпэўнены, што ўсё гэта шарлатанства, іншыя — што мы маем справу з прынцыпова новым словам у навуцы, дзякуючы якому перамożам самыя цяжкія, нават невылечныя хваробы. Большая частка падобных спрэчак датычыцца так званых ствалавых клетак (СК). Нібыта яны нейкія цудадзейныя. Дзе тут праўда?***

— У чалавечым арганізме звыш 200 тыпаў клетак. Кожны від мае сваю спецыялізацыю. Адны складаюць нервовую сістэму, другія — крывяносную, трэція фарміруюць касцявую тканку і гэтак далей. Ствалавыя ж не маюць ніякай «спецыялізацыі». Але яны здольныя ператварацца ў любы тып клетак. І робяць гэта на працягу ўсяго жыцця чалавека ў залежнасці ад запатрабаванняў тых ці іншых органаў. Па сутнасці СК — бясцэнныя запасныя часткі, без якіх арганізм не змог бы абнаўляцца і вельмі хутка старэў бы і гінуў. Ва ўлонні маці кожны з нас пасля зачацця ўяўляў сабой адзіную ствалавую клетку. Яна дзялілася, даючы жыццё не толькі такім жа, як яна, сародзічам, але і іншым тыпам клетак, з якіх паступова будаваліся ўсе часткі цела. Гэты працэс нагадвае радавое дрэва з моцным ствалом, галінамі, лісцем. Адсюль і назва — ствалавыя клеткі. Чым старэйшы чалавек, тым іх у яго менш. Я даступна тлумачу?

***— Так, дзякуй, што з парога не «патапілі» ў прафесійнай тэрміналогіі. Трэба разумець, менавіта гэта ўласцівасць ствалавых клетак — ператварацца ў любыя, так бы мовіць, будаўнічы матэрыял нашага арганізма — і навяла вучоных на думку выкарыстоўваць іх у лячэнні розных захворванняў. Як гэта выглядае на практыцы?***

— Ну, напрыклад, уявіце сабе чалавека, якому зрабілі складаную аперацыю на трахеі. Бывае, што рубец зацягваецца вельмі дрэнна, выклікаючы розныя ўскладненні. Часам патрабуецца не раз і не два паўтараць хірургічнае ўмяшальніцтва. Але можна пайсці іншым шляхам. Абкалоць рану ствалавымі клеткамі. І яны ў лічаныя дні, набыўшы патрэбную спецыялізацыю, дапамогуць зажывіць тое месца, дзе папрацаваў скальпель хірурга. СК не толькі дыферэнцыруюцца ў патрэбны тып клетак, але і прымушаюць іх у падобных надзвычайных сітуацыях хутка дзяліцца і аднаўляць тканку. Такім жа чынам лечацца розныя траўмы, апёкі, язвы, узнікаючых на скуры. Дзякуючы падобнаму метаду паспяхова вядзецца барацьба з хваробамі крыві, сэрца, печані, лёгкіх, страўнікава-кішачнага тракту, мочапалавой сістэмы. Скажу больш, з'явілася магчымасць даць бой і тым захворванням, перад якімі сучасная медыцына да гэтага часу была практычна бяссільная. Напрыклад псарыязу, рассеянаму склерозу, эпілепсіі, дзіцячаму цэрэбральнаму паралічу, хваробам Паркінсона і Альцгеймера. Карацей кажучы,



цэламу шэрагу аўтаімунных паталогій арганізма, якія характарызуюцца тым, што імунная сістэма дзейнічае супраць сваіх жа здаровых клетак і бялковых злучэнняў. СК у гэтым выпадку, з аднаго боку, падаўляюць звышагрэсіўны імунітэт, а з другога — аднаўляюць разбураную нервовую тканку.

***— Ну, калі гэта тэхналогія такая цудадзейная, то чаму мы не прымяняем яе ў шырокіх маштабах?***

— Па-першае, яна новая і, нягледзячы на станоўчыя вынікі, усё яшчэ выклікае ў многіх пэўны скепсіс. Па-другое, такія інавацыі — справа не танная. Тлумачу схему работы з пацыентам. Каб увесці яму ствалавыя клеткі, патрэбна мець іх дастатковую колькасць. У арганізме чалавека іх мала, хоць яны прысутнічаюць амаль у кожным органе. Задача — здабыць невялікую частку СК (звычайна яны бяруцца з тлушчавай тканкі на жываце) і нарасціць іх біямасу ў спецыяльных лабараторных умовах. На гэта патрэбна каля трох тыдняў. Зразумела, праводзіцца строгі аналіз якасці адабранага матэрыялу. І вось калі мы маем яго неабходную колькасць, можна прыступаць да лячэння. Усё гэта адбываецца ў філіяле нашага інстытута — Рэспубліканскім навукова-медыцынскім цэнтры «Клетачныя тэхналогіі». Там жа пацыент павінен прайсці абследаванне. Я расказваю вельмі схематычна, але працэс далёка не просты і каштуе немалых грошай.

***— Колькі ж трэба заплаціць?***

— Усё залежыць ад захворвання. Калі, напрыклад, лечым трафічную язву, то адзін сеанс абыдзецца прыкладна ў дзве тысячы рублёў. Скажу «адзін» таму, што праз паўгода-год, звычайна, прыходзіцца паўтараць працэдуру, бо хвароба надзвычай непадатлівая. Традыцыйнымі спосабамі яе амаль ніколі не ўдаецца перамагчы. А з дапамогай ставалавых клетак чалавек хоць на некаторы час можа забыцца на сваю бяду. Я прывёў прыклад, калі абколваюцца толькі месцы паражэння скуры — лакальны метад. А ёсць яшчэ больш складаны, сістэмны, калі «прэпарат» уводзіцца ўнутрывенна. Тады аплата ад трох да пяці тысяч рублёў. Заўважу, што можна выкарыстоўваць і донарскі матэрыял. Эфект будзе той жа, бо ствалавыя клеткі вельмі добра прыжываюцца і ў чужым целе.

***— Наколькі шмат пацыентаў праходзіць у Беларусі праз падобныя «аперацыі»?***

— Дакладнай лічбы няма — некалькі сотняў пацыентаў у год. Дарэчы, сёння клетачныя тэхналогіі прымяняюцца не толькі ў нашым цэнтры, але яшчэ ў некалькіх установах Мінска, напрыклад у РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, Мінскім навукова-практычным цэнтры хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі. Дык вось калі ўсе магутнасці падключыць на поўную моц, то ствалавымі клеткамі ў краіне штогод можна лячыць да 20—30 тысяч чалавек. І гэта не мяжа, бо падобныя цэнтры можна арганізаваць не толькі ў сталіцы.

***— А іншаземцы? Вы маглі б зарабляць валюту.***

— Дзеля гэтага трэба мець велізарныя сродкі на рэкламу. У нашага інстытута іх няма. Крыўдна, што пра дасягненні айчыннай клетачнай інжынерыі нічога не ведама нават беларусам. Здзіўляюся, калі чую, што вядзецца збор грошай на лячэнне ў Ізраілі якога-небудзь дзіцяці. За мяжой такая паслуга каштуе 50—100 тысяч долараў. У нас — у дзесяць разоў танней. І ты не менш назіраем вось такія парадоксы. Пры тым што і якасць аказання дапамогі, і кваліфікацыя персаналу ў нас не горшыя. Аб гэтым сведчаць вынікі работы.

***— Не магу не задаць і такое пытанне. У СМІ шмат гавораць пра тое, што клетачныя тэхналогіі не сумяшчальныя з маральнымі нормамі, а тым больш з рэлігійнымі перакананнямі людзей. У чым тут справа?***

— А ў тым, што трэба ўважліва разабрацца, хто на якіх прынцыпах стаіць. Даказана, што найбольш актыўныя і пластычныя ствалавыя клеткі, якія здольныя ператварацца ва ўсе тыпы клетак, знаходзяцца ў эмбрыёне. Яны так і называюцца — эмбрыянальныя. Але ж мы працуем толькі з біялагічным матэрыялам дарослых людзей, не прычыняючы ім ніякай шкоды. Як можна было даведацца з маіх слоў, СК бываюць розных відаў. Мы ў асноўным выкарыстоўваем мезенхімальныя ствалавыя клеткі, якія адбіраем з касцявога мозгу, слізістай абалонкі носа, або, што часцей за ўсё, з тлушчавай тканкі. Гэтыя, так бы мовіць, біялагічныя адзінкі вылучаюцца вельмі высокімі якасцямі і здольныя лячыць многія захворванні, аб якіх ужо казаў. Так што з маральнага пункту гледжання ў нас усё чыста.

> **«Ствалавыя клеткі здольныя ператварацца ў любы тып клетак. І робяць гэта на працягу ўсяго жыцця чалавека ў залежнасці ад запатрабаванняў тых ці іншых органаў. Па сутнасці СК — бясцэнныя запасныя часткі, без якіх арганізм не змог бы абнаўляцца і вельмі хутка старэў бы і гінуў».**

***— Апошнім часам у сувязі з клетачнымі тэхналогіямі часта даводзіцца чуць пра банкі пупавіннай крыві. Што гэта за з'ява такая?***

— Ёсць у Мінску такая паслуга. Сутнасць вось у чым. Падчас нараджэння дзіцяці, як вядома, перараразаецца пупавіна. Яе потым утылізуюць. Так адбывалася спакон веку, пакуль вучоныя не выявілі, што кроў гэтага органа змяшчае вялікую колькасць ствалавых клетак. Калі іх захаваць, то гэта будзе для новароджанага выдатнай страхоўкай. Атрыманыя клеткі можна будзе выкарыстаць для яго лячэння ў выпадку складанай сітуацыі. Самая вялікая каштоўнасць СК пупавіннай крыві ў тым, што, акрамя вялікай актыўнасці, яны маюць абсалютную генетычную ідэнтычнасць з тканкамі роднага арганізма. Таму многія бацькі падпісваюць дамоўленасць з радзільным домам, каб вопытны акушэр па ўсіх правілах забраў кроў з пупавіны іх дзіцяці і адвёз у той самы банк. Там з гэтага біяматэрыялу вядзяляюць ствалавыя клеткі, змяшчаюць у асобную ячэйку і замарожваюць у вадкім азоце. Думаю, такі капітал, які ў замарожаным стане здольны захоўваць свае якасці многія дзесяткі гадоў, не перашкодзіць нікому. Ужо сёння пупавінныя СК могуць эфектыўна лячыць дзясяткі захворванняў сваіх «гаспадароў». А што, калі праз нейкі час з іх дапамогай медыкі і зусім будуць рабіць нешта неверагоднае? Навука і тэхналогіі цяпер развіваюцца фантастычнымі тэмпамі.

***— Цікава. Скажыце, можа дзякуючы ствалавым клеткам мы нарэшце зможам перамагчы і рак?***

— На жаль, не. Ва ўсякім разе пакуль. Справа ў тым, што яны маюць адну адмоўную рысу — падаўляюць імунітэт. А ў барацьбе са злаякаснай пухлінай гэта недапушчальна. Але не трэба адчайвацца. Супраць раку ёсць іншая інавацыйная тэхналогія, якая выкарыстоўвае ўласцівасці так званых дэндрытных клетак. Іх роля — распазнаваць усіх ворагаў, якія трапляюць у наш арганізм, і даваць аб іх дакладную інфармацыю іншым клеткам, якія пасля атрымання сігналу пачынаюць знішчаць чужакоў. Такая ж вайна павінна весціся і супраць клетак анкалагічных пухлін. Але яны паводзяць сябе настолькі каварна, што імунная сістэма дае збой. Да гэтай пары біёлагі ніяк не могуць навучыцца яе дакладна «бачыць», дзе здаровыя, а дзе ракавыя тканкі. Дык вось з дапамогай дэндрацытаў гэтая праблема можа быць вырашана. Ужо ёсць абнадзейлівыя вынікі ў лячэнні дадзеным метадам некаторых відаў анкалогіі. Напрыклад, раку малочнай і падстраўнікавай залозаў. Так што будзем спадзявацца на поспех.

***— А чаго чакаць ад клетачных тэхналогій тым, хто хоча амаладзіцца?***

— Калі якая-небудзь клініка пабяцае вярнуць вас у дні першай маладосці — не верце. Пакуль такіх магчымасцяў няма. Што мы гарантавана можам, дык гэта істотна адкавіць скуру ў любой частцы цела. Калі, напрыклад, жанчына пажадае з дапамогай фібрабластаў пазбавіцца ад маршчын на твары, то, канешне, пасля адпаведных працэдур яна будзе выглядаць гадоў на пяць, а то і на дзесяць маладзейшай.

***— Андрэй Яўгенавіч, якімі Вы бачыце перспектывы клетачных тэхналогій?***

— Грандыёзнымі. Радуе тое, што дзяржава нядрэнна фінансуе работу нашага інстытута. Значыць, ёсць разуменне таго, што за клетачнай тэрапіяй будучыня. На жаль, да гэтай пары ніхто не займаецца падрыхтоўкай кадраў для гэтага кірунку навукова-практычнай дзейнасці. Дарэчы, тут неабавязкова павінны працаваць медыкі, могуць і біёлагі. Аднак на сённяшні дзень такіх спецыялістаў, якія ў стане правесці лячэнне пацыента ствалавымі клеткамі ад пачатку і да канца, у Беларусі назбіраецца не больш за два дзясяткі.

***— Калі заўтра аб'явяць, што ў нейкай краіне са ствалавых клетак вырасцілі чалавечы орган, вы паверыце?***

— Паверу. На 3D-прынтары гэта можна зрабіць хоць сёння. Я толькі не паверу, што такое тварэнне будзе працаваць. Чалавечы орган — не кусок дзеравяшкі. Там столькі клетак, тканак, разнастайных біялагічных элементаў, што стварыць іх штучна і прымусіць без збояў узаемадзейнічаць паміж сабой пакуль нерэальна. Хіба праз некалькі дзясяткаў гадоў.

**Гутарыў Міхаіл КАВАЛЁЎ.**

# ФОТА НА ПАМЯЦЬ

...Помню гэтае лета, адно з многіх, калі нам удалося выправіцца ўсім — гэта значыць, ужо ўпляцёх, з «поўным камплектам» дзяцей — адпачываць да бабулі, мамінай мамы, у невялікі прыморскі гарадок. Вінаград і абрыкосы, якія падалі проста пад ногі ў дворыку, нязмоўчны шум блізкай аўтастанцыі, дзе дыспетчар ненатуральна бадзёрым голасам пачынала абвяшчаць аб прыбыцці аўтобусаў прыкладна а пятай раніцы, а заканчвала — пасля адзінаццатай вечара, грукат таварнякоў на чыгунцы, пад які, як ні дзіўна, толькі лепш засыналася, і асаблівы, напоўнены морам, сонцам, солллю, ружамі, садавіной, ды бог яшчэ ведае чым, водар паветра, якое хацелася закатаць у слоік і ўзяць з сабой у хмарны Мінск. Штодзённыя вылазкі на мора — на досвітку, калі яшчэ не горача, і пад вечар, калі вада ўжо хоць і каламутная, але цёплая-цёплая... І, як абавязковы пункт у спісе — сямейнае фота. Прычым не ў якога-небудзь махляра з малпай ці ўдавам, якія пачкамі блукалі па Пляжнай вуліцы, а ў сапраўднага майстра, бабулінага знаёмага — у атэлье ў цэнтры горада. З самага ранку дзядуля і тата выбіралі «парадныя» кашулі і доўга, прыдзірліва галіліся, а нас з сёстрамі ў чатыры рукі з уговорамі, пагрозамі, абяцанкамі і подкупам адзелі ў прыгожыя сукенкі мама з бабуляй. Я за лета нечакана так вырасла, што ўсё-такі адстаяла майку і шорты. Не менш давялося папакутаваць і ў атэлье, дзе вентылятар мала ратаваў ад духаты, а строгі фатограф надта доўга прымяраўся і перастаўляў нас так і гэтак, каб атрымаўся, як ён казаў, «ансамбль». Затое праз некалькі дзён дзядуля ўрачыста прынёс раздрукаваныя фатаграфіі — каляровыя, матавыя, вялікага фармату, дзе мы не адразу пазналі сябе ў адрэтушаваных круглашчокіх істотах. Адзін са здымкаў заняў цэнтральнае месца над бабулінай канапай, другі мама беражліва загарнула ў некалькі слаёў паперы і прывезла дамоў, каб таксама паставіць у рамку.

Затое цяпер гэты сямейны партрэт — адзін з самых любімых ва ўсіх нас. Бабулі і дзядулі ўжо даўно няма, аднак фота кожны раз абуджае ўспаміны пра іх, пра мора, пра лета, пра дзяцінства. Пра смажаную рыбу, абрыкосавыя піражкі, паход у горы па кізіл і ўвосень гэта ўсё.

Чамусьці здаецца, што чым больш даступнай стала фатаграфія, тым больш яна абясцэнілася. Калі фатаграфаванне было падзеяй і адбывалася рэдка, з пэўнай важнай нагоды, то да яго рыхтаваліся, добра запаміналі і ўсе абставіны, і ўсіх людзей, якія трапілі ў кадр. Прыгадайце — некалі было добрым тонам, знаёмячыся, напрыклад, з сям'ёй сяброўкі або маладога чалавека, ветліва прагледзець яе ці яго сямейны альбом, паслухаць расповед пра старэйшае пакаленне, пра іншых сваякоў і атрымаць такім чынам уяўленне пра некалькі пакаленняў цэлага роду. Цяпер жа ў лепшым выпадку хуценька пакажуць фоткі на экране смартфона ці прышлюць спасылку на альбом у сацсетках, прычым здымкі сямейнага адпачынку часам губляюцца сярод коцікаў, сэлфі і гастранамічных «справаздач». Не падабаецца ўласнае фота — выдалім, пераробім: прыгожая поза, высны «качкай» або адрэпеціраваная ўсмешка... У многіх маіх знаёмых і сяброў захоўваюцца гігабайты здымкаў на камп'ютарах і адзінкі — раздрукаваных на памяць. Мабыць, гэта тая ж гісторыя, што і з папяровымі кнігамі: мала хто захоўвае ім вернасць у той час, як зручней і прасцей чытаць з экрана. І ўсё ж, усё ж... Як ні дзіўна гэта прагучыць, папяровыя носьбіты часам аказваюцца больш трывалымі і даўгавечнымі за лічбавыя — і менавіта іх, гэтыя матавыя і глянцавыя, каляровыя і чорна-белыя, потым з цікавасцю перабіраем мы самі, нашы дзеці, унукі. Таму — не пaлянуйцеся, складайце сямейныя альбомы. Потым як знойдзеце.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


Сямейная газета

Выпуск № 22 (113)


Уладары сяла

# «МУЖ УГАВАРЫЎ ПАЖЫЦЬ У ВЁСЦЫ...»

## Маладая сям'я — пра сельскія клопаты, няўменне адпачываць і перамогу ў конкурсе

**Іна Хацкевіч нарадзілася і большую частку жыцця правяла ў Віцебску. І падумаць не магла, што пераедзе на вёску. Даіць карову, напрыклад, яна не ўмела і дагэтуль адносіцца да гэтай жывёлы з асцярогай. І калісьці дакладна не змагла б паверыць у тое, што разам з мужам і дзецьмі выйграе рэспубліканскі конкурс «Уладар сяла», дзе вызначалі найлепшую вясковую сям'ю...**




Фота Андрэя САЗОНАВА.

### З горада — у вясковую глыбінку

З будучым мужам Мікалаем гараджанка пазнаёмілася, калі прыехала ў вёску Вяжышча Бешанковіцкага раёна пагасціць да стрыечнага брата:

— У мясцовай школе была спартыўная секцыя па баскетболе, а ў мяне — дзіцяча-юнацкі разрад, вось я і прыйшла пагуляць. Звярнула тады ўвагу, што сярод дзяцей быў адзін старэйшы хлопец.

Якім жа было здзіўленне Іны, калі праз нейкі час гэтага самага Мікалая яна ўбачыла сярод гасцей у сябе дома. Аказваецца, яе родны брат быў з ім добра знаёмы і запрасіў на дзень нараджэння. З таго часу і пачаліся іх адносіны. Пасля вяселля, калі паўстала пытанне, дзе будуць жыць маладыя, у кожнага з іх на гэты конт мелася сваё меркаванне.

— Я была ўпэўнена, што муж пераедзе да мяне ў горад, — кажа Іна. — Але пакуль мы чакалі нашага першынца, Коля ўгаварыў мяне пажыць у яго ў вёсцы. Там у мясцовым калгасе ён праходзіў двухгадовую адпрацоўку пасля тэхналагічнага тэхнікума, быў загадчыкам майстэрняў. Вырашылі, што і дзіцяці будзе лепш на прыродзе. У хуткім часе ў нас нарадзіўся другі сын. Ну а потым мы развялі жыўнасць і зараз ужо не ўяўляем іншага жыцця.

Сёння ў іх гаспадарцы 80 перапёлак, каля 60 курэй, 20 індыкоў, свінкі. З бычкоў зімаваць застаўся толькі Уладар, якога сям'я атрымала ў падарунак на абласным этапе конкурсу «Уладар сяла». Яшчэ ёсць чатыры сабакі і дзве кошкі. Сям'я апрацоўвае гектар зямлі, дзе вырошчваюць пшаніцу, бульбу, садавіну. З часам набылі неабходную тэхніку, у прыватнасці трактар і ЗІЛ. Прычым першапачатковa трактар быў не ў найлепшым стане, а Мікалай уласнымі рукамі прывodзіў яго ў парадак. Іна, дарэчы, таксама ўмее кіраваць усёй тэхнікай:

— Калі муж загразне на трактары, еду выцягваць яго на ЗІЛе. Калі ён на ЗІЛе, еду на дапамогу на трактары.

Жанчына прызнаецца, што пераезд у вёску не быў складаным. Жыццё ў плане побыту не надта адрознівалася ад гарадскога: усе выгоды — у доме, маецца ванна і пральная машынка. Нават аўтобусы прыпынак насупраць дома. Адзінае, што бянтэжыла, як ні дзіўна, — шум.


*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*


■ Святасць мацярынства

# ЯК БУСЛУ ДАДАЦЬ РАБОТЫ, або Нараджаць — гэта здорава

**Пазашлюбныя сексуальныя кантакты, вялікая колькасць сірот, разводы, непаслухмянасць, а часам і жудасныя паводзіны дзяцей, зніжэнне нараджальнасці, што паступова вядзе да вымірання народаў, — вось тыя праблемы, якія былі агучаны падчас VI форуму «Святасць мацярынства», што сабраў у Мінску больш за 400 удзельнікаў з розных краін — прадстаўнікоў органаў дзяржуправы, традыцыйных рэлігій, грамадскіх дзеячаў, медыкаў, псіхолагаў, сацыяльных работнікаў.**

Адзін са шляхоў умацавання сям'і — вяртанне да традыцыйных каштоўнасцяў, супрацьстаянне ідэям, што навязваюцца праз сучасныя сродкі камунікацыі і інфармацыі. Напрыклад, міжнароднымі інстытутамі і глабальнымі фондамі прасоўваецца так званая гендарная ідэалогія, якая ўздзейнічае на свядомасць моладзі. З іншага боку, пэўныя фармацэўтычныя кампаніі таксама лабіруюць свае інтарэсы і навязваюць стандарты паводзінаў. Так, гарманальная кантрацэпцыя сёння выкарыстоўваецца як лекі ад усіх гінекалагічных праблем, што насамрэч супярэчыць медыцынскай навуцы. Апошнія даследаванні паказваюць, што падобныя сродкі не спрыяюць памяншэнню колькасці абортаў і замест таго, каб дапамагчы жанчыне перамагчы гінекалагічныя хваробы, па факце прыводзяць да таго, што праблемы з дзетараджэннем яшчэ больш ускладняюцца.

### Свабода ці агрэсія?

Уласна, захаванне жаночага здароўя і прафілактыка абортаў сталі тэмай аднаго са шматлікіх круглых сталоў, якія праводзіліся ў межах форуму. Урачы, псіхолагі, сацыяльныя работнікі і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый падзяліліся сваімі назіраннямі і вопытам.

«З тых часоў, як у жанчыны з'явілася магчымасць выбіраць — станавіцца ёй мамай ці не, мы назіраем яе агрэсіўныя паводзіны ў дачыненні да свайго рэпрадуктыўнага здароўя і сацыяльна-біялагічнай функцыі: гэта дашлюбныя палавыя зносіны, працяглы тэрмін выкарыстання сродкаў кантрацэпцыі перад першымі родамі. Сярэдні ўзрост пачатку палавога жыцця ў дзяўчат — 14 гадоў, у той час як першынца беларускі нараджаюць у 26 гадоў, а расіянкі нават пазней. За 10—15 гадоў палавога жыцця жанчына набывае вялікую колькасць гінекалагічных і іншых захворванняў, якія істотна зніжаюць яе рэпрадуктыўны патэнцыял, адсюль і вялікая колькасць самаадвольных абортаў, цяжарнасцяў, якія не развіваюцца... Кожны палавы кантакт для арганізма — інфармацыя аб магчымым наступленні цяжарнасці, і калі гэта перарываецца штучна, узнікае рэфлекс «ёсць адносіны — няма цяжарнасці», што становіцца прычынай псіхалагічнага бясплоддзя», — заўважыў **доктар медыцынскіх навук, загадчык кафедры акушэрства і гінекалогіі Валгаградскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Мікалай ЖАРКІН.**


*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Сацыяльная кансультацыя

# Вы маеце права на дапамогу

***Ці мае права на дапамогу ў сувязі з нараджэннем дзіцяці ўсынавіцель, калі на падставе рашэння суда аб усынаўленні зменена дата нараджэння дзіцяці і яго ўзрост стаў менш за 6 месяцаў? На момант усынаўлення дзіцяці было 11 месяцаў (дата нараджэння — 11.10.2017), але рашэннем суда яго дата нараджэння была зменена, і дзіця стала маладзейшым (новая дата нараджэння — 15.07.2018). Рашэнне суда аб усынаўленні ўступіла ў сілу з 25.09.2018.***

(**Ірына,** *г. Гомель*).

Адказвае **консультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана КОВАЛЬ:**

— Права на аднаразовую дапамогу ў сувязі з нараджэннем дзіцяці маюць асобы, якія ўсынавілі (удачарылі) дзіця ва ўзросце да 6 месяцаў (арт. 11 закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей»).

Памер дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці вызначаецца на дату нараджэння ўсыноўленага дзіцяці.

Пры вызначэнні права на дапамогу ў сувязі з нараджэннем дзіцяці і памеру гэтай дапамогі разглядаецца дата нараджэння дзіцяці, якая змешчана ў пасведчанні аб яго нараджэнні, гэта значыць 15.07.2018. Паколькі дзіця 15.07.2018 года нараджэння, і ўсыноўленае 25.09.2018 (ва ўзросце да 6 месяцаў), права на дапамогу ў сувязі з нараджэннем дзіцяці ваша сям'я мае.

Звярнуцца па прызначэнне дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці неабходна на працягу 6 месяцаў з дня ўступлення ў сілу рашэння суда аб усынаўленні дзіцяці — у вашым выпадку не пазней за 25.03.2019 года.

Дакументамі, на падставе якіх вам будзе прызначана ўказаная дапамога, з'яўляюцца пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці і копія рашэння суда аб усынаўленні (удачарэнні). Пры гэтым усынавіцель (удачарыцель) замест поўнай копіі рашэння суда можа прадставіць частковую выпіску з гэтага рашэння без указання звестак аб мінулым дзіцяці.

Дадаткова варта адзначыць, што з дня ўступлення ў сілу рашэння суда аб усынаўленні дзіцяці (з 25.09.2018) ваша сям'я мае права і на прызначэнне дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

* * *

## Якія сем'і могуць разлічваць на паслугу няні?

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны нам паведамілі, што такая паслуга аказваецца сем'ям, якія выхоўваюць дваіх і больш дзяцей, якія нарадзіліся адначасова (двойню, трайнят) ва ўзросце да 3 гадоў, дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў — у межах 20 гадзін у тыдзень (трайнят — да 40 гадзін).

Паслуга аказваецца бясплатна:

сем'ям, якія выхоўваюць дваіх і больш дзяцей, якія нарадзіліся адначасова;

няпоўным сем'ям, якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 4 гадоў, і поўным сем'ям, якія выхоўваюць дваіх і больш дзяцей-інвалідаў, адзін з якіх ва ўзросце да 4 гадоў.

На платнай аснове (па сацыяльна нізкіх тарыфах) паслуга аказваецца поўным сем'ям, якія выхоўваюць адно дзіця-інваліда, — да дасягнення ім узросту 4 гадоў і сем'ям, якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце ад 4 да 18 гадоў.

Пры гэтым катэгорыі сем'яў, якія маюць права на паслугу няні, паслядоўна расшыраюцца. Так, з гэтага года права на паслугу няні атрымалі сем'і, у якіх абодва бацькі — маці (мачаха), бацька (айчым) — альбо адзін з бацькоў у няпоўнай сям'і з'яўляюцца інвалідамі I або II групы.

Нагадаем, што аказанне сацыяльных паслуг ажыццяўляецца па заяўным прынцыпе пры звароце ў ТЦСАН па месцы жыхарства. Інфармацыя пра адрасы і тэлефоны цэнтраў размешчана на сайтах цэнтраў, камітэтаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Дарэчы, у першым паўгоддзі 2018 года паслугамі няні скарысталіся 1957 сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, у тым ліку 1703 сям'і, якія выхоўваюць двойню да 3 гадоў, 46 сем'яў, якія выхоўваюць трайнят да 3 гадоў, і 208 сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў.

**Святлана БУСЬКО.**

# ЯК БУСЛУ ДАДАЦЬ РАБОТЫ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

Негатыўнае стаўленне да цяжарнасці і думкі аб аборце, нават калі жанчына яго і не зрабіла, не застаюцца «непачутымі» — малы «выяўляе» сваё нежаданне з'яўляцца на свет, дзе яму не



**«За 10—15 гадоў палавога жыцця з кантрацэпцыяй і абортамі жанчына набывае вялікую колькасць гінекалагічных і іншых захворванняў, якія істотна зніжаюць яе рэпрадуктыўны патэнцыял, адсюль і вялікая колькасць самаадвольных абортаў, цяжарнасцяў, якія не развіваюцца...»**

рады: павялічваецца колькасць абвіцця пупавіны, расце працэнт кесаравых сячэнняў.

Часта сужэнцы не маюць фізіялагічных праблем, але зачаць дзіця ў іх не атрымліваецца. Пры выкарыстанні ж тэхнік перынатальнай псіхалогіі цяжарнасць і роды маюць месца. «Калі перынатальны псіхолаг будзе падтрымліваць жанчыну, вучыць яе пэўнай форме паводзін, цяжарнасць праходзіць экалагічна і якасна, па-іншаму ўспрымаюцца роды. Вельмі важна, з якімі эмоцыямі парадзіха да іх падыходзіць», — упэўнена **кандыдат псіхалагічных навук Расійскага нацыянальнага даследчыцкага медуніверсітэта Тацццяна БРЭСО.** Часта будучых мамачак пужаюць, замест таго, каб паказаць, што пра роды трэба думаць не як пра боль, а як пра радасць. Толькі пры такім падыходзе жанчына ўпэўнена паводзіць сябе падчас родавага працэсу і выходзіць з яго не такой змучанай пакутамі і, што галоўнае, не баіцца праз некаторы час зноў нараджаць.

## Лагойск супраць абортаў

Важна працаваць не толькі з пацыентамі, але і з медперсаналам. Не сакрэт, што акушэр-гінеколаг мае над жанчынай вялікую ўладу. Часта менавіта ад гэтага доктара залежыць выбар жанчын, якія трапілі ў складанае становішча і не ведаюць, што рабіць з незапланаванай цяжарнасцю. Неабходна рыхтаваць спецыялістаў, нацэленых на захаванне дэмаграфічнага патэнцыялу, фарміраваць маральныя ўстаноўкі, выкладаць ім біяэтыку, вучыць паважаць жыццё з моманту зачацця. Тут мала проста мець спецыяльныя праграмы для ўсіх, хто працуе ў галіне захавання рэпрадуктыўнага здароўя — неабходна заканадаўча абараніць урачоў, на якіх могуць «наехаць» пацыенткі за адмову рабіць аборт.

І трэба сказаць, што заканадаўства таксама паступова мяняецца, а ўрачы, якія лічаць штучнае перарыванне цяжарнасці злом, карыстаюцца новымі магчымасцямі. Так, невялікі беларускі гарадок выступіў супраць «дзетазабойства». **Ірына КАЗЛОЎСКАЯ, акушэр-гінеколаг Лагойскай раённай цэнтральнай бальніцы, пераможца конкурсу «Жанчына года — 2017»** і, між іншым, шматдзетная мама, адной з першых уголас заявіла пра сваё нежаданне рабіць аборты: «Калі я даведалася, што ў Расійскай Федэрацыі ўнесены папраўкі ў закон, якія даюць права на адмову ўрача ад перарывання цяжарнасці, я чакала такіх змен у нашым заканадаўстве. І, як толькі яны былі прынятыя, літаральна на наступны дзень напісала заяву аб адмове, а ўслед за мной і мае калегі. І сёння Лагойск — горад, дзе не робяць абортаў. Як вынік, бачу, сталі мяняцца ўстаноўкі жанчын. Раней яны ведалі, што можна прыйсці і без усялякіх пытанняў будзе перарывацца цяжарнасць, а зараз працэдура ўскладнілася, і яны ўжо думаюць, як папярэдзіць непажаданую цяжарнасць. Мне даводзілася чуць ад жанчын, якіх адгаварылі ад абортаў, "дзякуй". Але я ўпэўнена, што сёння трэба шмат гаварыць з падлеткамі, менавіта ў іх стаўленне да ўзаемаадносін і замест запужванняў, накшталт "не прынясі ў падоле", усяляць упэўненасць, што «калі-небудзь у іх будуць дзеці з каханымі людзьмі ў шчаслівых сем'ях».

## «Паліп» назвалі Лізай

Між іншым, адно з апошніх даследаванняў паказала, што на пытанне, «Што б вы рабілі, калі б аборты былі забароненыя?», большасць жанчын адказала: «Нараджалі б». На жаль, сёння куды часцей на цяжарную, якая рашаецца зрабіць аборт, уплываюць тыя, хто побач: партнёр, бацькі, а часам і чужыя людзі.

«Урачы не ўбачылі дзіця, сказалі, што гэта паліп, і калі прыйшла паўтарана, паведамілі, што ён вырас. А сёння гэтаму «паліпу» дзевяць гадоў. Завуць Лізай, — дзеліцца сваёй гісторыяй шматдзетная маці, **кіраўнік маскоўскага фонду «Жанчыны за жыццё» Наталля МАСКВІЦІНА.** — Падчас цяжарнасці мяне накіроўвалі на аборты (што для мяне, як веруючага чалавека, непрымальна), адгаворвалі: «Навошта такой маладой у 25 гадоў нараджаць трэцяе дзіця?». І калі я чула гэтыя жахлівыя прапановы пра чыстку, разумела, што цяпер проста не маю права не дапамагаць жанчынам, якія трапляюць у такое ж становішча».

Сёння арганізацыя аб'ядноўвае тысячы валанцёраў у розных гарадах, вядуцца антыабортныя курсы, штодзень маніторацца сацыяльныя сеткі і спецыяльная праграма адсочвае жанчын, якія ў інтэрнэце заяўлялі пра аборт. Ствараюцца спісы, і такія жанчыны «размяркоўваюцца» паміж валанцёрамі (найчасцей жанчынамі, якія маюць дзяцей і ведаюць, як падтрымаць тых, хто трапіў у складанае становішча). У крызісных сітуацыях цяжарным жанчынам дапамогуць не толькі з кансультацыямі спецыялістаў, але і матэрыяльна: бясплатна можна атрымаць рэчы і для парадзіхі, і для немаўляці, нават праблемы з жыллём вырашальныя.

**Негатыўнае стаўленне да цяжарнасці і думкі аб аборце, нават калі жанчына яго і не зрабіла, не застаюцца «непачутымі» — малы «выяўляе» сваё нежаданне з'яўляцца на свет, дзе яму не рады.**

Такія ж арганізацыі дзейнічаюць і ў Беларусі. У межах сацыяльнага праекта «Ты не адна» праводзяцца мерапрыемствы на базах медустаноў, з'явілася інтэрактыўная карта, на якой паказаны ўсе віды бясплатных паслуг для цяжарных, і гэта не толькі дапамога медыкаў, псіхолагаў, юрыстаў, але і арганізацыі вольнага часу: спартыўныя аб'екты, музеі, курсы. У выніку міжведамаснага ўзаемадзеяння здзяйсняецца падтрымка жанчын, якія трапілі ў складанае становішча. У сацыяльным цэнтры «Шчаслівы малы» можна атрымаць як гуманітарную дапамогу, так і адукацыйную, маладым матулям падкажуць, як даглядаць малога, як знайсці працу. Тут яны знойдуць сяброў, абзавядуцца карыснымі кантактамі, а галоўнае, стануць больш упэўненымі і адчуюць, як гэта здорава — быць мамай.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Словам за жыццё

# Як размовы з псіхолагам дапамагаюць нарадзіцца сотням маленькіх беларусаў

**Абавязковае перадабортнае псіхалагічнае кансультаванне ў краіне ўвялі ў 2015-м, але толькі ў мінулым годзе пры жаночых кансультацыях пачалі адкрывацца спецыяльныя кабінеты «За жыццё». Што адбываецца за іх дзвярыма, расказала псіхолаг-валанцёр МГДА «Цэнтр падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля»» Таццяна БАРШЧЭЎСКАЯ.**



## Выпадковых цяжарнасцяў не бывае

На маёй далоні ляжыць штучны эмбрыён. Цельца мяккае і зусім маленькае — сантыметраў пяць-шэсць, не больш. Ён настолькі натуралістычна зроблены, што здаецца: вось-вось расплюшчыць вочкі і заварушыцца. Такія на кансультацыях паказваюць жанчынам, якія ўпэўнены, што ў іх унутры «маленькая гарошына, якая нічога не адчувае».

— Мы не адгаворваем ад аборту. У гэтым проста няма сэнсу. Калі жанчына цвёрда вырашыла: «Зраблю!» — яна зробіць, і ніякія кансультацыі для яе перашкодай не стануць. Наша задача — даць інфармацыю і падвесці пацыентку да пэўных разважанняў пра сваю будучыню, — кажа Таццяна.

Не дарма пасля размовы з псіхолагам даецца тры дні на тое, каб пабыць сам-насам са сваімі думкамі. Большасць жанчын да канца не разумеюць, што такое аборт і якія наступствы ён можа мець.

— Часта даводзіцца чуць пра «выпадковую цяжарнасць». Але, давайце па шчырасці: выпадковых цяжарнасцяў не можа быць у прынцыпе. Калі ты знаходзішся ў дзетародным узросце і вядзеш палавое жыццё, то ў любы момант можа адбыцца зачацце. Ісціна старая, як белы свет.

На кансультацыях жанчыны ўзростам крыху за трыццаць робяць «прызнанні старшакласніц»: «Не разумею, як гэта магло здарыцца. Мы ж карысталіся прэзерватывам». І гэта ў XXI стагоддзі! Калі кожны падлетак ведае, што прэзерватыў (як і іншыя метады кантрацэпцыі) не дае стапрацэнтнай абароны. Па статыстыцы ў 12 выпадках са 100 пры выкарыстанні прэзерватыва здараецца цяжарнасць.

Што самае складанае ў працы псіхолага, які праводзіць перадабортныя кансультацыі? На гэтае пытанне Таццяна ні на імгненне не задумваючыся адказвае: «Заахвоціць жанчыну да размовы».

— У кабінет прыходзяць жанчыны з каменным выразам твару і заяўляюць: «Усё ведаю і разумею. Падпішыце даведку, і я пайду». Быццам дзвярыма памыліліся ці, увогуле, іх гэта не датычыцца. Яны баяцца нават размаўляць пра тое, што з імі адбываецца. Але няведанне не вызваляе ад адказнасці. Перш за ўсё за ўласнае жыццё. Таму так важна ў размове даць магчымасць паглядзець на сябе збоку.

Існуе стэрэатып, што на аборты ў асноўным ідуць маладзенькія дзяўчаты. Насамрэч самая частая наведвальніца гэтага кабінета — жанчына 30—35 гадоў, у якой ужо ёсць дзеці. Хоць, канешне, трапляюць сюды і непаўналетнія, і студэнткі, і матулі-адзіночкі, і тыя, каму за 45.

## Праблема не ў грашах, а ў галаве

Летась у краіне нарадзілася 102 тысячы дзяцей. Магло б нарадзіцца на 25 тысяч больш, калі б не аборты. Якія прычыны прымусілі жанчын пайсці на гэты крок?

**«У мяне няма грошай на дзіця».** Калі разважаць аб'ектыўна, то ў наш час гэта не прычына, каб адмовіцца ад нараджэння дзіцяці. Ёсць фінансавая падтрымка ад дзяржавы. Існуюць спецыяльныя фонды, якія гатовы забяспечыць рэчамі першай неабходнасці, прадуктамі. У адказ на гэтыя аргументы чую: «Хачу, каб мой сын/дачка ні ў чым не меў патрэбы». Але справа ў тым, што дарагія цацкі, адзенне, прыватныя садкі патрэбны не дзецям, а бацькам, для таго каб самаўпэўніцца і даказаць іншым: у нашых дзяцей было ўсё. Але гэтае «ўсё» часта не ўключае ў сябе самага галоўнага — любові і ўвагі. Калі яны будуць, то дзецям усё адно, колькі каштуе іх адзенне і ў якой кватэры яны жывуць.

**«Я не гатовая» ці «Хачу пажыць для сябе».** Жыццё — рэч непрадказальная. У момант, калі мы будзем гатовыя да нараджэння, у нас можа не атрымацца. Звычайная сённяшняя справа — нават абсалютна здаровыя не могуць нарадзіць. Што казаць пра тых, хто прайшоў праз аборт і тым панізіў свае шанцы на мацярынства?

Цікава, што з такімі фармулёўкамі прыходзяць не толькі маладзенькія дзяўчаты, але і жанчыны, якія ўжо маюць адно-два дзіцяці.

**«Я не планавала цяжарнасць».** У наш час, калі жанчыны сталі надзвычай дзелавымі і занятымі, цяжарнасць для некаторых ледзь не канец свету. Яна не ўпісваецца ў цякучае жыццё і выбівае з зоны камфорту. Таму ад «гэтай праблемы» імкнуцца як мага хутчэй пазбавіцца, забываючыся пра тое, што традыцыйна галоўнае прызначэнне жанчыны — быць матуляй.

**«Я не жыву разам з хлопцам» ці «Мы з мужам збіраемся разысціся».** Боязь застацца адной з дзіцем на руках натуральная. Але ніхто не задумваецца над тым, што нараджэнне гэтага дзіцяці можа перамяніць жыццё ў лепшы бок. Ці нават зберагчы адносіны, даць новы імпульс для развіцця.

Аднак сустракаюцца і зусім нечаканыя прычыны для абортаў. Жанчыны, якія маюць негатыўны вопыт першых родаў, баяцца нараджаць другі раз. Асабліва гэта датычыцца тых, хто зацяжарыў у сталым узросце. На жаль, многія сутыкаюцца з нетактоўнымі паводзінамі медыцынскага персаналу. Гінеколагі і медсёстры часам не ўпускаюць магчымасці проста ў твар сказаць жанчыне, што яна «для родаў стараватая» і «дзіця хутчэй за ўсё народзіцца нездаровым». Безумоўна, такія суб'ектыўныя выказванні і прагнозы — недапушчальныя. Рэпрадуктыўны ўзрост закладзены прыродай. І калі ты ў 45 адчуваеш, што хочаш і можаш нарадзіць, ніхто не ў праве цябе асуджаць.

**— Як працуеце з жанчынамі, якія зацяжарылі ў выніку гвалту?**

— Гэта асаблівы выпадак, які патрабуе не адной планавай кансультацыі, а цэлага цыклу. Вядома, з гэтымі пацыенткамі размова вядзецца зусім не такая, як з астатнімі. Але яшчэ раз падкрэслю: у нас няма мэты схіліць жанчыну да таго, каб яна адмовілася ад аборту. Нараджаць ці не — асабістая справа кожнай.

Адно з абавязковых пытанняў на кансультацыях датычыцца таго, як жанчына прыняла рашэнне перарваць цяжарнасць — сама, з мужам ці сваімі бацькамі, сяброўкамі. Нярэдка высвятляецца, што некаторых маладых дзяўчат да аборту схіляюць уласныя матулі і бабулі.

— Здзіўляе і пазіцыя большасці мужчын. Яны абыякавыя да таго кроку, на які ідуць іх жонкі і дзяўчаты. Маўляў, прымай рашэнне сама, табе ж нараджаць або не нараджаць і пасля з гэтым жыць. Чаму так? Відавочна, баяцца адказнасці. І, канешне, не да канца разумеюць і не хочуць разумець, што такое аборт і які шлейф праблем за ім цягнецца.

Не сакрэт, што з наступленнем цяжарнасці ў арганізме жанчыны адбываецца гарманальная перабудова. Аборт парушае натуральныя працэсы, выклікае стрэс. Усё гэта адбіваецца на здароўі. Калі не адразу, то ў далейшым. Французскія навукоўцы нават правялі даследаванні і прыйшлі да высновы, што рак малочнай залозы ў сталым узросце — гэта наступствы аборту ў маладосці.

## Назад не вернеш

Працэнт жанчын, якія перадумваюць рабіць аборт пасля кансультацый, пакуль што дакладна вызначыць немагчыма.

— Абапіраючыся на ўласны досвед, скажу: дзве-тры з дзесяці цяжарных вырашаюць пакінуць дзіця. Гэта не можа не радаваць, бо гаворка ідзе пра жыццё чалавека, — кажа Таццяна. — Словамі не перадаць тыя эмоцыі, якія ўзнікаюць, калі да нас прыходзяць матулі са сваімі дзеткамі. Здаецца, зусім нядаўна мы на кансультацыях разбіраліся, чаму «не». А сёння яна дзякуе табе за тое, што передумала і сказала «так» свайму будучаму дзіцяці.

Але што адбываецца з тымі, хто даведу задуманае да канца? Таццяна лічыць, што псіхалагічная кансультацыя неабходна жанчынам не толькі перад абортам, але і пасля. Праўда, для гэтага патрэбныя спецыялісты з адпаведнай адукацыяй. Універсітэцкіх ведаў для таго, каб працаваць з жанчынамі ў такіх крызісных сітуацыях, недастаткова. Трэба абавязкова праходзіць перападрыхтоўку і наведваць спецыялізаваныя курсы. Пакуль беларускія псіхолагі толькі вучацца працаваць у гэтым кірунку.

— Разуменне ўсёй сур'ёзнасці ўчынку прыходзіць не адразу. Постабортны сіндром — рэальная псіхалагічная траўма, якая можа зламаць жыццё не толькі аднаму чалавеку, але і ўсёй сям'і. Жанчына пачынае вінаваціць мужа, які яе не адгаварыў. Калі ў далейшым аборт прывядзе да бясплоднасці, то і мужчына можа папракнуць: сама ва ўсім вінаватая. І нават калі жанчына зрабіла аборт употай ад блізкіх, лягчэй ёй не будзе. Рашэнне прымаецца хутка, а думкі аб ім застаюцца на ўсё жыццё. Таму жадаю ўсім прымаць толькі рашэнні, аб якіх не давядзецца шкадаваць!

**Ганна КУРАК.**

Мамін дзённік

# Там, дзе валадараць паны

**«Прыдумаюць жа розныя штукі!» — кажа Аляксандр Фёдаравіч, гледзячы, як яго меншы праўнук дрыгае ножкамі ў дзіцячым шэзлонгу і ловіць цацкі на прымацаванай на ім дузе. «Для маіх дзяцей найлепшай забавай было сядзець на печы», — успамінае дзядуля (між іншым, ветэран вайны) і расказвае пра сваю маці, якая гадавала дзяцей так, як прыйдзецца. Жне жыта — значыць немаўля побач, спіць у стажку. Закрычыць — грудзьмі пакорміць і далей за серп.**

Ніякіх дзіцячых прыстасаванняў, акрамя бадай падвешанай да столі люлькі, не было. Пакінуць малое на ложку, абкладуць падушкамі, каб не скацілася, і завіхаюцца па гаспадарцы. На шпацыраванне з каляскай па два разы на дзень не было ні часу, ні ўласна самой каляскі. Галоўным у хаце быў муж, да прыходу якога павінна было быць усё гатова.

Паўгода мы з Арцёмкам выходзілі на вуліцу двойчы на дзень. Цяпер, калі няма дажджу, абмяжоўваемся толькі адным шпацырам. Усё астатняе — кармленні, развівальныя гульні, заняткі на фітболе, расслабляльны масаж, купанне і такія доўгія цырымоніі адыходу на кароткі сон — па плане. Гатаванне вячэры і іншы хатні клопат у ім — пад пунктам нумар два.

Дзякуй богу, калі нешта не зроблена, мой муж не папракае каронным: «Ты ж у дэкрэце!» Ужо ў першую ноч дома, калі сыты сын, праігнараваўшы свой утульны ложачак, нарэшце заснуў пасярэдзіне бацькоўскай канапы, выселіўшы галаву сям'і на вузенькае крэсла-ложак, муж з усмешкай сказаў: «У нас з'явіўся пан», — і гэтым самым вынес вердыкт, хто ў сям'і галоўны.

Раней першых да стала запрашалі мужчын, якія ненадоўга адрываліся ад свайго цяжкага клопату (а яго, асабліва ў вёсцы, хапала). Дзеці даядалі тое, што засталося. Мы ж, пакуль малога не пакормім, самі есці не сядзем.

Ужо з маленства сучасныя дзеці дыктуюць нам свае правілы. Калі нам сустракацца з сябрамі, калі хадзіць у цырульню, калі, у рэшце рэшт, спаць... Але расказала б я пра бяссонныя ночы тым жанкам, якія і жыта жалі, і скаціну дагледалі. Не ведалі яны, як і нашы матулі, пра падгузкі, якія пазбавілі сучасных жанчын мазалёў на руках ад мыцця бялізны па некалькі разоў на дзень. Не мелі яны і цудадзейных дэвайсаў, якія сёння і прыгатуюць, і прыбяруць, і іншыя справы зробяць — дастаткова націснуць кнопачку. Ды і дзякэтаў доўгі час ніхто не даваў, а тым больш не плаціў за тое, што ты гадуеш уласных дзяцей. А іх у тагачасных сем'ях звычайна было як мінімум трое.

Сёння ж статус шматдзетнасці прыраўноўваецца ледзь не да подзвігу. Тут як з адным справіцца! Хоць, дзякуючы гэткім розным штукам, усё ж нешта можна паспець. Пакуль Арцёмка гойдаецца ў шэзлонгу (з якога, каб не рамяні, ужо даўно выскачыў бы) і пільна слухае свайго прадзеда, які, як можа, забаўляе нашчадка, на пліце даварваецца боршч, а на паліцы — ужо стос папрасаванай бялізны.

Часам і паны бываюць літасцівыя...

**Вераніка КАНЮТА.**

# ШЛЯХ ДА СЯБЕ

## Ніколі не позна ўскочыць у апошні вагон

**Яе фільмы прыцягваюць сваёй шчырасцю і лірычнасцю, яе вершы — нібыта пасланні з паралельнага свету. Маці пяцярых дзяцей, паспяховы рэжысёр дакументальных фільмаў, паэтэса і філантроп Любоў БІТНО ў лістападзе гасцюе ў часопісе «Алеся». Да ўвагі чытачоў «Звязды» — фрагменты размовы.**

***— Вы былі ўжо гаспадыняй сям'і, аўтарытэтным выкладчыкам рускай мовы і літаратуры... І раптам вырашылі атрымаць яшчэ адну адукацыю. Навошта?***

— Аднойчы я вырашыла правесці для сяброў паэтычны вечар па Бродскім. Гэты паэт заўсёды быў для мяне загадкай, хацелася разабрацца ў ім і навучыцца яго выконваць. Падрыхтавалася, запрасіла любімых людзей. Пачала чытаць вершы і раптам адчула, што мяне не слухаюць. Ці то я дрэнна зразумела паэта і не вельмі добра чытаю, ці то мае госці хочуць выканаць Бродскага самі і не хочуць слухаць мяне. І тады я ўсвядоміла, што хачу валодаць выканальніцкімі навыкамі на прафесійным узроўні. «Няхай гэта будзе кіно», — падумала я.

Маё паступленне ў Акадэмію мастацтваў было азартнай авантурай. Ішоў ужо май ці нават чэрвень, таму я не паспявала падрыхтавацца і прыйшла здаваць экзамен з нуля, разлічваючы на базу пасля філфака. На мяне паглядзелі і сказалі: «Ну, фактура ёсць», і нейкім цудам мне ўдалося «ўскочыць у апошні вагон».

Калі пачала вывучаць кіно, зразумела, што ў ім ёсць усё, што я люблю: музыка, жывапіс, слова, тэмпарытм. Крок за крокам я старалася асэнсаваць яго, але многаму яшчэ трэба навучыцца.

***— Вы гаворыце як сціплы чалавек. Аднак, між іншым, вашы фільмы становіліся прызёрамі самых разнастайных кінафестываляў. Ці дапамагаюць вам дасягаць творчых вышынь вашы блізкія?***

— Вядома. Разам з мужам мы заснавалі студыю паэтычнага кіно «Сафія». Мой муж вельмі таленавіты чалавек, выдатна піша і падбірае музыку да тэксту: аздобіў многія мае вершы, дапамагае з агучваннем фільмаў.

***— А як ужываюцца два творчыя чалавекі?***

— Здаецца, мы знайшлі аптымальную дыстанцыю, каб лёгка было абодвум. І ў нейкім сэнсе азартна быць побач з такім чалавекам. Назіраеш, як выдатна ён усё робіць, як высока лётае, і думаеш: «Я таксама туды хачу». Але часцей даводзіцца быць паасобку. Яму трэба палётаць у сваім небе, а мне ў сваім. Але мы заўсёды разам злятаем на зямлю і радасна сустракаемся там. Мы такія розныя, але мы ж добра дапаўняем адно аднаго. А наша сустрэча — гэта гісторыя дзвюх палярнасцяў.

***— Ваша творчая біяграфія — гэта, па сутнасці, гісторыя пра пошукі сябе. На пэўным этапе развіцця вы пачалі пісаць вершы. Гэты дар таксама быў у вас закладзены першапачаткова?***

— У дзяцінстве я, як і многія, складала нейкія смешныя вершыкі, проста рыфмавала, таму што мне гэта падабалася. Мне было 15 гадоў, калі сябар падарыў мне двухтомнік славутай паэтэсы. Я прачытала яго як быццам на адным дыханні, за некалькі сутак. Гэтыя кніжкі ўсё перавярнулі ў маёй свядомасці, я многае зразумела пра сябе. Цяпер для мяне стварэнне вершаў — своеасаблівы падарунак. Вельмі кароткія перыяды жыцця, калі мая душа як быццам становіцца камертонам для гукаў звонку. Я слухаю і стараюся адлюстраваць свае вобразы ў вершаваных радках, бо ведаю, што гэта шчасце бывае са мной нядоўга.

***— Тое, што з вамі адбываецца на працягу жыцця, можна ахарактарызаваць такім папулярным у сучаснай моладзі паняццем, як «самарэалізацыя». Іншымі словамі, вам пашчасціла выявіць і прымяніць усе закладзеныя ў вас здольнасці і магчымасці. Якая з іх самая дарагая для вас?***

— Самае важнае для мяне тое, што мне пашчасціла быць маці. І не аднойчы. Вельмі радасна адчуваць сябе маці пяцярых дзяцей. Бо кожнае — гэта абсалютны чысты дар кахання. Таму дзеці — самае галоўнае, што ў мяне ёсць. І больш за ўсё на свеце я хацела б быць не паэтам, рэжысёрам або настаўнікам, а ідэальнай мамай.

Але ёсць і іншы бок — адказнасць. Наш абавязак зрабіць так, каб траўмы і раны, якія, магчыма, мы атрымалі ў дзяцінстве, не пераходзілі ў спадчыну нашым дзецям. І гэта вельмі складаная задача, выканаць якую не заўсёды атрымліваецца. Мае дзеці выраслі цудоўнымі, але часам я задумваюся, якімі б яны былі, калі б я стала маці ў больш сталыя гады, калі пошукі сябе засталіся ў мінулым...

***— Відаць, менавіта вашае адказнае стаўленне да дзіцячых праблем натхніла вас на вялікі дабрачынны праект для дзяцей-сірот і тых, хто апынуўся ў цяжкай сітуацыі?***

— Я задумалася над тым, як атрымалася, што ў Беларусі, дастаткова цывілізаванай еўрапейскай краіне, 21 тысяча сірот? Чаму ў некаторых бедных краінах няма такога паказчыка, і там людзям не зразумела, што такое сірата? Чым павінна хварэць грамадская свядомасць, каб дапусціць такую трагедыю? А між іншым, акрамя сірот, колькі людзей знаходзіцца ў інтэрнатах, дамах для састарэлых, дамах для інвалідаў і ментальных інвалідаў... Якая маральная катастрофа павінна была адбыцца, каб грамадства выпіхвала нейкія свае часткі?...

Задумваючыся над тым, як дапамагчы дзецям, я заўсёды чакала, што з часам далучуся да якога-небудзь адпаведнага праекта. Але потым зразумела, што павінна стварыць яго сама. Спачатку мне здавалася, што ім усім — і крызісным бацькам, і крызісным дзецям — у першую чаргу неабходна псіхалагічная дапамога. Аднак у нас не прынята звяртацца да псіхолага, і людзі чамусьці баяцца гэтага. Тады я зразумела, што перш чым прапанаваць дапамогу псіхолага, іх трэба падтрымаць больш далікатным спосабам. Напрыклад, падцягнуць дзіця па вучобе, каб яно магло паступіць туды, куды жадае, а не куды атрымліваецца. Каб яно пачало паважаць сябе, каб навучылася працаваць, каб убачыла плады сваіх намаганняў.


У мары няма ўзросту.

Я кінула «кліч» у інтэрнэце: шукала настаўнікаў, якія маглі б гадзіну ў тыдзень пазаймацца з такімі дзецьмі. Як ні дзіўна, знайшлося шмат энтузіястаў, якія гатовы былі займацца і больш, чым гадзіну.

Так з'явіўся праект «Беларусь: прафесіяналы — дзецям у цяжкай жыццёвай сітуацыі». Мы шукаем псіхолагаў, рэпетытараў, юрыстаў, праваахоўнікаў, бізнес-кансультантаў, спонсараў... Усіх, хто гатовы нам дапамагчы. Калі я ўбачыла моцны водгук ад людзей, я зразумела, што рабіла гэта не дарэмна, праблема наспела даўно, і грамадства гатова яе вырашаць. Людзі ахвяруюць сваім часам і грашыма, каб дапамагчы праекту. А гэта дарагога каштуе.

***— Першая ваша прафесія — педагог. Не сумуеце па ёй, па вучнях?***

— Я ж не зусім развіталася з гэтай прафесіяй. Апошнім часам займаюся з абітурыентамі, якія рыхтуюцца паступаць у Акадэмію мастацтваў. Мне вельмі падабаецца з імі працаваць: вельмі люблю раскрываць асобу і дапамагаць ёй развівацца. У свой час я з задавальненнем працавала і ў школе. Але тое не вельмі паважлівае стаўленне, якое апошнім часам адчувае настаўнік, не лепшым чынам адбіваецца і на дзецях. На жаль, у школьнага настаўніка зараз столькі бюракратычных абавязкаў, што не застаецца часу ні на любімую справу, ні на любімых дзяцей.

***— Вы ўсё жыццё шукалі сябе. Разам з тым не патанулі ў бытавых праблемах, паспяхова спраўляліся з імі. У выніку поўнасцю рэалізавалі свае задаткі. Што б вы маглі пажадаць людзям, якія не задаволены сваім жыццём, не знайшлі справу па душы, плывуць па цячэнні і адчуваюць сябе нешчаслівымі?***

— Галоўнае, што патрэбна кожнаму чалавеку, — гэта зразумець сябе. Я хацела б пажадаць усім людзям слухаць сваё сэрца і быць сабой.

**Віталіна БАНДАРОВІЧ.**



Сям'я Любові БІТНО.


**БелВЭБ**

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ОАО «Банк БелВЭБ» на 30 сентября 2018 г.**

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | 30.09.2018 (неаудировано) | 31.12.2017 |
|---|---|---|
| **Активы** | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 687 949 | 720 387 |
| Драгоценные металлы | 311 | 504 |
| Средства в кредитных организациях | 62 344 | 59 207 |
| Кредиты клиентам | 2 667 532 | 2 586 356 |
| Инвестиционные финансовые активы, оцениваемые по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | 577 086 | 537 413 |
| Инвестиции в ассоциированные компании | 3 929 | 3 891 |
| Основные средства | 137 661 | 147 372 |
| Активы, построенные для продажи | - | 7 848 |
| Инвестиционная недвижимость | - | 4 295 |
| Нематериальные активы | 40 217 | 36 096 |
| Текущий актив по налогу на прибыль | 33 | 2 757 |
| Отложенные активы по налогу на прибыль | 2 760 | 15 385 |
| Прочие активы | 36 335 | 31 906 |
| **Итого активы** | **4 216 157** | **4 153 417** |
| **Обязательства** | | |
| Средства кредитных организаций | 968 839 | 1 050 670 |
| Задолженность перед Национальным банком Республики Беларусь | 21 | 5 009 |
| Средства клиентов | 2 241 179 | 2 341 774 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 16 603 | 4 507 |
| Текущие обязательства по налогу на прибыль | 3 676 | 8 215 |
| Отложенные обязательства по налогу на прибыль | 437 | 988 |
| Прочие обязательства и резервы | 208 395 | 33 112 |
| Субординированный кредит | 217 940 | 199 340 |
| **Итого обязательства** | **3 657 090** | **3 643 615** |
| **Капитал** | | |
| Уставный капитал | 473 057 | 473 057 |
| Эмиссионный доход | 458 | 458 |
| Дополнительный капитал | 5 485 | 5 485 |
| Фонд переоценки зданий | 22 492 | 22 771 |
| Доходы по инвестиционным ценным бумагам, оцениваемым по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | 10 413 | 16 606 |
| Нераспределенная прибыль / (накопленный дефицит) | 47 162 | (17 756) |
| **Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка** | **559 067** | **500 621** |
| Неконтрольные доли участия | - | 9 181 |
| **Итого капитал** | **559 067** | **509 802** |
| **Итого капитал и обязательства** | **4 216 157** | **4 153 417** |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ОАО «Банк БелВЭБ» за период, закончившийся 30 сентября 2018 г.**

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | За 9 месяцев, закончившихся 30.09.2018 (неаудировано) | За 9 месяцев, закончившихся 30.09.2017 (неаудировано) |
|---|---|---|
| **Процентные доходы** | | |
| Кредиты клиентам | 194 721 | 226 054 |
| Инвестиционные финансовые активы | 24 956 | 42 052 |
| Средства в кредитных организациях | 950 | 1 977 |
| Финансовая аренда | 32 | 70 |
| | **220 659** | **270 153** |
| **Процентные расходы** | | |
| Средства кредитных организаций | (34 563) | (58 655) |
| Средства клиентов | (47 552) | (62 959) |
| Субординированный кредит | (6 592) | (10 146) |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | (909) | (569) |
| | **(89 616)** | **(132 329)** |
| **Чистый процентный доход** | **131 043** | **137 824** |
| Резерв под обесценение активов, приносящих процентный доход | (15 588) | (89 913) |
| Эффект от модификации договорных условий по кредитам | 6 330 | - |
| Эффект первоначального признания активов, по которым начисляются проценты | (17 333) | (646) |
| **Чистый процентный доход после резерва под обесценение** | **104 452** | **47 265** |
| **Чистые комиссионные доходы** | **46 270** | **40 686** |
| Чистые доходы / (расходы) по операциям в иностранной валюте: | | |
| – торговые операции | 22 624 | 21 308 |
| – операции с производными финансовыми инструментами | 10 | (151) |
| – переоценка валютных статей | (13 500) | 13 |
| Доля в чистом (убытке) / прибыли ассоциированных компаний | (62) | 1 |
| Финансовый результат от выбытия дочерних компаний | 4 280 | 1 036 |
| Прочие доходы | 24 887 | 29 243 |
| **Непроцентные доходы** | **84 509** | **92 136** |
| Расходы на персонал | (49 487) | (47 156) |
| Амортизация | (17 936) | (16 310) |
| Налоги, кроме налога на прибыль | (2 715) | (2 709) |
| Прочие операционные расходы | (43 112) | (45 850) |
| Прочие доходы/(расходы) от обесценения и восстановления/создания резервов | 2 721 | (1 674) |
| **Непроцентные расходы** | **(110 529)** | **(113 699)** |
| **Прибыль до налога на прибыль** | **78 432** | **25 702** |
| Налог на прибыль | (17 115) | (8 216) |
| **Прибыль за отчетный период** | **61 317** | **17 486** |
| Приходящиеся на: | | |
| – акционеров Банка | 60 412 | 16 118 |
| – неконтрольные доли участия | 905 | 1 368 |

Председатель Правления банка В.С. Матюшевский

Главный бухгалтер И.И. Мерзлякова

21 ноября 2018 г.

*Консолидированная бухгалтерская (финансовая) отчетность, составленная в соответствии с требованиями МСФО, размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке/Финансовые показатели деятельности банка/Квартальная финансовая отчетность/Квартальная финансовая отчетность по МСФО за 2018 год».*

*ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 № 6. УНП 100010078.*

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

## ОАО «БНБ-Банк»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а

### Консолидированный Бухгалтерский баланс на 1 октября 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2018 | 2017 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 9 796 | 10 921 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 28 120 | 38 194 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 25 407 | 38 570 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 89 430 | 56 738 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 313 801 | 298 542 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 3 228 | 204 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 57 | - |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 18 425 | 27 477 |
